Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І. Слабодчыкава ”

# Інтэлектуальная гадзіна

# «Беларуская скарбонка»

Настаўнікі-дэфектолагі
Н.А.Цімашчук
Г.П. Пратасевіч

**Інтэлектуальная гадзіна «Беларуская скарбонка»**

*Задачы:* сістэматызаваць і замацаваць веды вучняў аб роднай мове, выклікаць цікавасць да вывучэння беларускага фальклору, выхоўваць любоў і павагу да культурных традыцый беларускага народа.

*Падрыхтоўка.*

Для правядзення інтэлектуальнай конкурснай праграмы ўсе прысутныя дзеляцца на дзве каманды, удзельнікі якіх выбіраюць капітанаў, падбіраюць назвы каманд. Кожная каманда рыхтуе невялікую інсцэніроўку народнага свята.

Дзеці прыносяць з дому ручнікі, дамотканыя посцілкі, коўдры, сурвэткі, ганчарныя вырабы для ўпрыгожвання кабінета. Вучні стараюцца аформіць клас святочна, у беларускім народным стылі.

Выбіраецца журы

**Вядучы.** Добры дзень, сябры! Сёння ў нас свята! Свята роднай мовы! Мы з вамі ўспомнім загадкі і казкі, прымаўкі і прыказкі, абрады і традыцыі правядзення народных свят.

Першы конкурс называецца «ГІрылады працы”

Кожная каманда атрымлівае карткі з намаляванымі прыладамі працы. Вы павінны хутка і правільна паказаць адпаведны малюнак-адгадку на маю загадку. Каманда, якая адгадае найболын загадак, і будзе пераможцам.

- ✓ Сам драўляны, а галава жалезная. *(Малаток.)*
- ✓ Дровы нарыхтоўвае працаўніца дбайная, галава сталёвая, тулава — драўлянае. *(Сякера.)*
- ✓ Есці век яна не просіць, хоць зубоў і многа мае, як працуе — сыпле проса, весела спявае. *(Піла.)*
- ✓ Ручка ёсць, а не граблі, зямлю рые, а не барана. *(Рыдлёўка.)*
- ✓ Маленькі, гарбаценькі, усё поле абскача. (Серп.)
- ✓ Ходзіць, скача па пакоі дзед з доўгаю барадою, як няма чаго рабіць, у куце тады стаіць. *(Венік.)*

Журы адзначае на дошчы правільныя адказы і вызначае пераможцу.

**Вядучы.** Наступны конкурс «Добры гаспадар»

*Ён таксама прысвечаны загадкам. Кожная каманда па чарзе называе адгадку. Калі адказу няма, то адгадвае другая каманда.*

Адкіну палена, адкіну другое, як і скіну крывое — выведу жывое. *(Распрагаць каня.)*

Як ляжыць, то меньшая за кацяня, а як паднімецца, то большая за каня. *(Дуга.)*

Чатыры колы летам бягуць, дзве дубовыя паненкі зімой слізгаюць, а іх гаспадар — адзін і ўзімку, і ўлетку. *(Калёсы, сані, конь.)*

Стальны пёс, у зямлю ўрос. *(Барана.)*

Калода — калодзішча, балота — балоцішча, воўк утапіўся, два зайцы цягнуць. *(Калодзеж, вядро, рукі.)*

Сівая карова праз дарогу пройдзе, а белая засядзе. *(Сыроватка, цадзілка, теарог.)*

Журы падводзіць вынікі, кожны правільны адказ ацэньваецца 1 балам.

**Вядучы.** Багацце і непаўторнасць нашай мовы шмат у чым вызначаюць прымаўкі і прыказкі. Яны дапамагаюць адчуць яе адметнасць, вобразнасць і

характво. Наш наступны конкурс называецца
«Працоуны дзень»

Каманды атрымліваюць набор картак. На адных змешчаны пачатак прыказак, на другіх — іх заканчэнне. За 2 хвіліны каманда павінна падабраць карткі так, каб можна было прачытаць тэкст цалкам.

*Сёння зробіш — заўтра як... *(знойдзеш).*

* Не адкладвай на заутра тое, што паспееш... *(зрабгць сёння).*

* Летні дзень... *(год корміць).*

* Колас да коласа... *(будзе сноп).*

* Хто працуе... *(тому і шанцуе).*

Журы аб'яўляе вынікі конкурсу.

**Вядучы.** А зараз

конкурс **«Родны кут»**

Капітаны становяцца побач на адну лінію, па чарзе называюць прымаўкі і прыказкі і робяць крок наперад. Выйграе той, хто зробіць болын крокаў, а значыць, успомніць болын прымавак і прыказак.

* Няма смачнейшай вадзіцы, як у роднай крыніцы.

* Свая хатка — як родная матка.

* У гасцях добра, а дома лепш.

* Чалавек без Радзімы, што салавей без песні.

* Як мы да людзей, так і людзі да нас.

* Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі.

*Для ўсякай птушачкі сваё зняздо мілае.

Журы аб'яўляе вынікі конкурсу.

У той час, калі каманды рыхтуюцца да паказу інсцэніровак народных свят, вядучы прапануе балелынчыкам конкурс «Казачная ліса»

Яны павінны назваць казкі, у якіх героем з'яўляецца лісіца.

*«Воўк, лісіца і аўца», «Мужык, воўк і ліса», «Лісіца-хітрыца», «Чаму барсук і лісіца ў норах жывуць», «Селянін, мядзведзь і лісіца», «Зайкава хатка», «Як кот звяроў напалохаў», «Коцік, пеўнік ілісіца», «Як лісіца еаўка судзіла»...*

**Конкурс «Назаві адным словам»**

Даць агульную назву прапанаваным словам. За правільны адказ — 1 бал.

*Страказа, муха, чмель (насякомыя).*

*Ружа, рамонак, валошка (кветкі).*

*Стрыж, ластаўка, еерабей (птушкі).*

*Фуфайка, спадніца, сукенка (адзенне).*

*Ліса, еоўк, бабёр (зеяры).*

*Чаравікі, боты, туфлі (абутак).*

**Конкурс «Складзі прыказку»**

Кожная каманда атрымлівае канверт са словамі. За 2 хвіліны трэба скласці прыказку, прачытаць яе і растлумачыць сэнс. За поўны адказ — 2 балы.

*Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.*

*Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі.*

*Дзе няма ахвоты, там няма работы.*

**Конкурс «Пагуляем у рыфмы”**

Кожнай камандзе прапанавана загадка. Неабходна дапоўніць яе словам ў рыфму

і адгадаць. За правільны адказ — 1 бал.

І ў сто гадоў я малады.
Мае насенне — ... *(Жалуды, дуб.)*
Я засцілаю дол іглiцай.
Спрадвеку слаўлюся ... *(Жывiцай, сасна.)*
Адна я ў лесе з белаю карой.
Багата сокам веснавой ... *(Парой, бяроза.)*

**Загадкі для балелынчыкау**

Адгадаць загадкі.
Хоць вусаты, хоць я колкі,
Ды не злосны анiколькі.
Лета ўсё адным заняты —
Кожны дзень спялю зярняты.
Не асыплюся на дол —
Хлебам я прыйду на стол.
*(Колас.)*
Летам я — рагатая,
Восенню хвастатая.
Хоць і горкая зусім,
Ды патрэбная ўсім.
*(Цыбуля.)*
У ваду нырае смела,
Хатку ён будуе ўмела.
Пад вадой і на вадзе
Будаўніцтва ён вядзе.
*(Бабёр.)*

**Конкурс «Загадкі-пытанні»**

За правільны адказ — 1 бал.
Чаго на свеце багацей няма? *(Зямлі.)*
Што ляціць без крылаў? *(Вецер.)*
Што хутчэй за ўсё на свеце? *(Думка.)*
Што гаворыць на ўсіх мовах? *(Язык.)*
Што без слёз плача? *(Скрыпка.)*
Што без вады плавае? *(Воблака.)*
Журы падводзіць вынікі праведзеных конкурсаў.

**Конкурс «Скорагаворкі»**

Кожная каманда атрымлівае канверт са скорагаворкай. Вучні вызначаюць прадстаўніка ад каманды, які будзе прагаворваць скорагаворку ўслых. Улічваецца хуткасць, выразнасць, дакладнасць. На падрыхтоўку адводзіцца 2 хвіліны.

За адказ без памылак — 5 балаў, пры нязначнай недакладнасці — 4 балы, калі прачытаў з памылкамі — 3 балы, збіўся — 2 балы, шмат памылак і недакладнасцей — 0 балаў.

Прытупіў пілу Піліп —
Пілаваў паленне з ліп.

Жвавы вожык жыва Жуку пашыў кажух.

Чорны-чорны грак прыcніў:
Ноччу драч драча дражніў.

**Конкурс «Наадварот»**

Падабраць словы з супрацьлеглым значэннем. За кожны правільны адказ бал.

*Ранак, зіма, высока.*

*Мяккі, часта, шырокі.*

*Чысты, ідзе, цяжка.*

**Загадкі для балелынчыкау**

Пад які куст заяц садзіцца, калі дождж ідзе?

*(Пад мокры.)*

Ці можа страус назваць сябе птушкай?

*(Не, бо гаварыцъ неўмее.)*

Дзе гарады без людзей, а рэкі без вады?

*(На глобусе, карце.)*

Дзе мароз улетку водзіцца?

*(У халадзільніку.)*

Чаго не абнясеш вакол хаты?

*(Вады ў рэшаце.)*

На чым знаку не наложыш?

*(На агні і вадзе.)*

**Конкурс “Выпраў памылкі”**

За кожны правільны адказ — 1 бал.

«Малако дае карова», —
Напісаў на кошцы Вова.
*(Дошцы.)*
Закрычаў Рыгорка:
«3 неба ўпала горка!»
*(Зорка.)*
Назбіралася народу:
Дзіва, поўны вулей лёду.
*(Мёду.)*
Весела звініць збанок,
Кліча: «Дзеці, на ўрок».
*(Званок.)*
Не праедзем, дружа:
На дарозе ружа.
*(Лужа.)*
Кажа Славік Светцы:
«Цесна тыгру ў кветцы».
*(Клетцы.)*

Журы падводзіць вынікі праведзеных конкурсаў.

**Конкурс «Наборшчыкі»**

З прапанаваных літар скласці як мага больш слоў, запісаць на ліст паперы, перадаць журы. На падрыхтоўку адводзіцца 2 хвіліны. Каманда, у якой запісана большая колькасць слоў, атрымлівае 3 балы, астатнія — 2 балы. Дадатковы бал прысуджаецца той камандзе, якая складзе самае доўгае слова.

Б, К, У, В, Р, А, Ы, К, Н, А *(букварынка)*

**Конкурс «Метаграмы»**

У зыходным слове замяніць адну літару, каб атрымалася іншае слова. За правільны адказ — 2 балы.

З *м* расту я на градзе.
*З р я* поўзаю ў вадзе.
*(Мак —рак.)*
Калі на *д* — паверхі маю.
Калі на л — дзяўбу, ламаю.
*(Дом — лом.)*
З **е** дружу з будаўнікамі.
З *а* купляй у хлебнай краме.
*(Бетон — батон.)*
Белы ўзімку, шэры летам —
Вось табе мае прыкметы:
З на **с** змяніць патрэбна,
Каб прадуктам быць мне хлебным.
*(Зайка — сайка.)*
У лесе з *б* мяне шукаеш
І з прыемнасцю
зразаеш.
Калі *б* на *п* заменіш —
Сцеражыся: захварэеш!
*(Грыб — грып.)*
*Я* маю сцены і куты,
Усё жыццё служу табе.
Мне **о** на *ы* заменіш ты —
Шукай у коміне мяне.
*(Дом — дым.)*
Стралу сталёвую
Узняў ажно да неба.
А разам з э —
Для фільмаў ён патрэбны.
*(Кран — экран.)*
Бачыць ты прывык мяне цякучай,
*Н* устаў — І стану я балючай.
*(Рака —ранка.)*
Да ўзвышша зычную дадай —
Машыну ў «стойла» заганяй.
*(Гара — гараж.)*

**Конкурс «Дамашняе задание»**

Прачытаць на памяць верш пра Беларусь або беларускую мову, якi падрыхтавалi дома. Улiчваецца выразнасць, артыстызм, дакладнае веданне зместу. За добры адказ каманда атрымлiвае 2 балы.

Журы падводзiць вынiкi конкурсаў.

**Вядучы.** Апошнi наш конкурс — **«Свята»**

Кожная каманда падрыхтавала невялiкiя сцэнкi, падабрала пытаннi i заданнi па свайму святу. Давайце паглядзiм, як у iх гэта атрымалася.

1- я каманда паказвае сцэнку **«Каляды».** Затым прапануе 2-й камандзе адказаць на пытаннi i назваць прыказкi i прымаўкi, якiя адносяцца да гэтага свята.

***Пытаннi***

Калi адзначаецца свята «Калядкi»? (З *7 па 19 студзеня.)*

Якая цэнтральная падзея ў калядным свяце? *(Калядаванне. Сяляне абыходзiлi хаты аднавяскоўцаў i выконвалi калядныя песнi. Калядоўшчыкi пераапраналiся ў казу, ваўка, мядзеедзя, жураўля, цыганку, гандляра, чорта i iнш.)*

***Прыказкi i прымаўкi***

Прыйшлi Калядкi — блiны i аладкi.

Калядкi — добрыя святкi: пад'еў ды на палаткi.

Насталi Калядкi, гаспадарам парадкi.

Па Калядах уночы трашчыць, а ўдзень плюшчыць.

2- я каманда паказвае сцэнку **«Саракi».** Затым прапануе 1-й камандзе адгадаць загадкi i назваць прыказкi i прымаўкi, якiя адносяцца да гэтага свята.

***Загадкi пра птушак***

Праз горы, далiны,
Праз тысячы сёл
З далёкай краiны
Вярнуўся пасол.
Спаважны, чыноўны,
Ён стаў на страсе
У ботах чырвоных,
Каб бачылi ўсе. *(Бусел.)*

У пагодлiвы дзянёк
Недзе з паднябесся
Пералiвiсты званок
Славiць працу песняй. *(Жаўранак.)*

Спераду шыльца,
Ззаду вiльцы,
Наверсе чорная палатка. *(Ластаўка.)*

Мабыць, ён не зведаў гора,
Не хадзiў нiколi голы.
Бо, як лета на дварэ
У сё вопратку дзярэ. *(Драч.)*

***Прыказкi i прымаўкi***

На Саракi пайшла зiма да ракi.

На Саракi *у* адзiн дзень сорак марозаў.

На Саракi вылятае сорак выраяў.

У канцы конкурсу журы падводзіць вынікі, аб'яўляе пераможцу.